# Сустрэча Я. Я. Сакалова з журналістамі «Звязды»

«Звязда», якая ў жніўні гэтага года адзначыць сваё 73-годдзе, выходзіць сёлета тыражом, рэкордным за ўсю сваю гісторыю — больш як 135 тысяч экземпляраў. Кола прыхільнікаў старэйшай беларускай партыйнай газеты павялічылася ў параўнанні з мінулым годам на 17 тысяч падпісчыкаў. І гэта не выпадкова, адзначалася ў час сустрэчы першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі Я. Я. Сакалова з журналістамі «Звязды», якая адбылася ў рэдакцыі 3 студзеня. Газета за апошнія гады, як сведчыць рэдакцыйная пошта, стала больш цікавай, змястоўнай, вострай. Але, як адзначалася, калектыў, які мае вялікі творчы патэнцыял, выкарыстоўвае далёка не ўсе свае магчымасці для прапаганды вопыту перабудовы ўсіх сфер жыцця рэспублікі, асвятлення працэсаў абнаўлення ў Кампартыі Беларусі, усебаковага аналізу цяжкасцей, з якімі сутыкаецца грамадства, эканоміка.

Удзельнікі сустрэчы, якая прайшла ў адкрытай, нефармальнай абстаноўцы, разважалі над месцам і роляй партыйнай прэсы ў перабудове. Чырвоным радком праходзіла думка: газета страціць аўтарытэт чытачоў, калі не будзе прынцыпова, з партыйных пазіцый адстойваць інтарэсы абнаўлення грамадства, сацыяльнай справядлівасці, павышэння дабрабыту працоўных, не будзе дбаць аб дзейснасці газетных публікацый, калі сабʼецца на драбнатэмʼе, сенсацыйнасць, аднабаковасць. І тут вельмі важным зʼяўляецца павышэнне асабістай адказнасці журналістаў.

Супрацоўнікі рэдакцыі расказалі, якой яны бачаць сваю газету ў новым годзе, як мяркуюць умацоўваць сувязь з чытачамі, падзяліліся сваімі праблемамі. Было падкрэслена: сёлета намаганні калектыву рэдакцыі ў адпаведнасці з перадвыбарнай платформай Кампартыі Беларусі будуць накіраваны ў першую чаргу на шырокае асвятленне падрыхтоўкі да выбараў народных дэпутатаў БССР і мясцовых Саветаў, а таксама справаздач і выбараў у пярвічных партыйных арганізацыях і партыйных камітэтах, падрыхтоўкі да XXVIII зʼезда КПСС і XXXI зʼезда КПБ, работы рэспублікі ва ўмовах гаспадарчага разліку. Як нацыянальная газета, «Звязда» мае намер больш шырока весці тэмы адраджэння беларускай мовы і культуры, друкаваць творы беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. Разам з тым, захоўваючы прынцыпы інтэрнацыяналізму, журналісты будуць расказваць аб культуры, духоўным жыцці прадстаўнікоў усіх нацыянальнасцей, якія жывуць у Беларусі.

Асобнай тэмай былі пытанні ўзаемаадносін партыйных камітэтаў і рэдакцый іх друкаваных органаў. Удзельнікі сустрэчы прыйшлі да адзінай думкі: яны павінны быць таварыскімі, канструктыўнымі, бо і журналісты, і работнікі парткамітэтаў заняты адной — партыйнай — справай.

Былі дадзены адказы на шматлікія пытанні звяздоўцаў.

У размове прынялі ўдзел сакратар ЦК КПБ А. С. Камай, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР, старшыня Дзяржплана БССР В. Ф. Кебіч, загадчыкі аддзелаў ЦК КПБ: арганізацыйна-партыйнай і кадравай работы — В. І. Борыс, ідэалагічнага — А. У. Русецкі, іншыя адказныя работнікі апарату ЦК КПБ.